**УДК 39**

# “ЖАНІЦЬБА ЦЯРЭШКІ” ЯК УНІКАЛЬНЫ ЭЛЕМЕНТ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

***А. С. ЦЫГАНКОВА***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Кожны гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі вылучаецца пэўнай спецыфікай традыцыйнай каляндарнай абраднасці. Адметным элементам каляндарнай традыцыі Беларускага Падзвіння з’яўляецца “Жаніцьба Цярэшкі” - адна з найбольш цікавых форм калядна-абрадавай гульні моладзі, якая дасягнула шлюбнага ўзросту. Распаўсюджана ў Лепельскім, Докшыцкім, Ушацкім, Полацкім раёнах Віцебшчыны.*

***Ключавыя словы***: *Жаніцьба Цярэшкі, Каляды, шлюб, “Полацкі канон”, спевы “бараны”, абрад ініцыяцыі.*

Дзеянне адбываецца на Каляды, калі здараецца разрыў часава-пpасторавай суцэльнасці, што сведчыць аб сканчэнні старога і пачатку новага свету. Разрыў між “тым” і “гэтым” светам робіць мяжу хісткай, што прыводзіць да з’яўлення ў нашым свеце душ продкаў. Адсюль і асноўнымі дзеячамі Жаніцьбы Цярэшкі з’яўляюцца “Дзед” і “Баба” – у народных вераваннях гэта прадстаўнікі боскага свету, якія *ўвасабляюць агульны вобраз продкаў, павінны былі забяспечыць урадлівасць гаспадарскіх палеткаў і жывёл, забяспечыць шчаслівы шлюб, сексуальную сілу і нараджэнне дзяцей* [6].

Падрыхтоўка да абрадавай гульні пачыналася з таго, што моладзь збіралася разам у агульнай хаце (пазней у карчме, бо, па-першае, гэта месца, дзе шмат моладзі, па-другое, з-за нясціплага характару гульні – сямейны дом не згаджаўся правесці гульню ў сябе, як гэта адбывалася са звычайнымі вячоркамі) і танчыла ўвесь вечар, быццам бы не збіраючыся Цярэшку жаніць. І толькі пад поўнач хтосьці з старэйшых кажа: будзем Цярэшку Жаніць.

Перыяд Калядаў можна разглядаць як пераходны перыяд у структуры каляндарнага года, калі парушаецца баланс светабудовы, каб пасродкам рытуала адрадзіцца наноў. Гэты дысбаланс прыводзіць да хаоса і дэструктыўнасці ў грамадстве. Каб пераадолець хаос і разлад, трэба было падзяліць усе дарослае насельніцтва на пары. То бок адна з галоўнах праблематык “Жаніцьбы Цярэшкі” – парадкаванне хаоса і наладжванне сацыяльнай структуры вескі.

Пасля абвяшчэння гульні пераходзяць да галоўных этапаў. Першы этап “Жаніцьбы Цярэшкі” – выбар “маці” і “бацькі”. На ролю бацькоў выбіралі людзей старэйшых, жанатых, яны былі вясёлыя і энергічныя. Часам іх чым-небудзь выдзялялі: “маці” апранала спадніцу, завязвала хустку, “бацька” прычаплялі бараду, *“адзяваў кажух, вывернуты навонку”* [5].

“Маці” вядзе ўсю гульню, а “бацька” ей падпявае і дапамагае. Надыходзіць працэс падбору пар – кульмінацыйны этап гульні (пары складаюць з улікам асабістых пажаданняў моладзі). Маці бярэ хлопца, а бацька дзяўчыну і пачынаюць “скручваць іх Лявоніхай”: спачатку маці танчыць з хлопцам, бацька з дзяўчынай, потым малады з маладой, бацька з маці, пад час дзеяння маці пяе: *“Божа мой, галоўка баліць,/ Як жа мне дзетак пажаніць,/ Якую мне раду даці,/ Які мне парадак даці./ Уладзька – сынулечка,/ Танечка – дачушачка,/ А й роўная парачка, / Нам гарэлкі чарачка”* [2, с. 8]. Працэс скручванне маладых мае магічны, рытуальны характар, бо праз сімвал скручванне ніткі, скручвалі маладых у трывалы сямейны саюз. “Круціцца ва сне – азначае хуткае вяселле”, але адначасова дзеяслоў “скруціцца” у дачыненні да дзяўчыны азначае страчаную ёю цноту [8, с. 116].

Пару, што “пажанілі”, садзяць разам і выбіраюць іншую. Пяе маці: *“Божа мой, галоўка баліць./ Як жа мне дзетак пажаніць? / А якую пару браць? / Дзетачкам парадак даць?/ Будзем жа піва варыць,/ Будзем жа сыноў жаніць,/ Будзем жа гарэлачку гнаць,/ Будзем жа дачок аддаваць./ Наташа, дачушачка,/ Іванька, сынулечка,/ Вот іхняя парачка,/ Ім гарэлкі чарачка”* [3, с. 666]. Пасля гэтага моманту маладыя станавіліся “дзедам” і “бабай”.

Бацькі, пасля таго, як ажэняць апошнюю пару, запрашаюць усіх на танец “Лявоніха”: маці з бацькам у крузе, астатнія вакол іх. Пасля таго, як маці патанчыць з усімі хлопцамі, а бацька з дзяўчынкамі, удзельнікі падзяляюцца на два шэрагі (дзяўчаты з левага боку, хлопцы з правага) утварыўшы мосцік. Цяпер кожная “бабулечка” даганяе свайго “дзядулечку”, потым наадварот. Існавала процьма разнастайных Цярэшак, якія спявалі пад час “даганькоў”, і дазвалялі маладым уступіць у спеўны

[5] Зап. эксп. ПДУ ў 1999 г. ад Фраленак Аляксандры 1937 г.н., в. Забалоцце Ушацкага р-ну.

дыялог, калі цябе падабаецца абраны партнер можна спець такія варыянты: *"Не ўцякай дядулечка, / Не ўцякай зязюлечка, / Я ж цябе люблю, люблю / Я ж цябе злаўлю, злаўлю", "Ах, мая бабулічка,/ Вішанька й налітая,/ З гэтай жа Цярэшачкі,/ Будзеш незабытая"* [9, с. 27]. Быў магчымы і іншы варыянт: *"Мой мілы камкуць, камкць, / Не умеіць ножанькай тапнуць, / Не ўмеіць ціханька хадзіць, / Не ўмеіць хораша любіць"* [1, с. 167], *"Белая рутанька на вокне, / Не далі дзядульку па мне, / Я росціку вышэйшага, / Гонару лепшейшага"* [5]. Спевы цярэшак – адзін з найбольш эмацыйных момантаў гульні, калі моладзь мела магчымасць кпіць і жартаваць адзін з аднаго: *"Ай, біда мая, біда, / Далі мне старога дзіда, / Старога, сварлівага, / Сляпога, журлівага. / Ні мне з ім у пір пайсці, / Ні мне з ім дома быці, / У пір пайсці – сварыцісі, / Дома быць – пабіцісі"* [2, с.77]. *"Ой беда, беда, беда./ Нашто Бог даў такога дзеда?/ Такога журлівага, / Такога сварлівага. / Ой гуляю, гуляю, / У вакенца паглідаю. / І дзеда пракленаю"*[6].

Есць шмат жартоўна-іранічных варыянтаў Цярэшак, але існавала пэўная культура спеваў: трэба быць добразычлівым і тактычным, нельга высмейваць сапраўдныя хібы чалавека, то бок, калі партнер глухі, забаранялася пра гэта пець: *"Здаецца і гром ня біў,/ Майго дзеда Пярун аглушыў"* [9, с.24]. Былі выпадкі, калі правілы не выконваліся і ігнараваліся дзяўчынай ці хлопцам, тады іх выводзілі з "гульні", і потым на працягу доўгага часу не запрашалі на танцы, вячоркі, то бок яны не былі часткай маладзевага калектыву. Сутнасць другога этапа заключаецца ў спеве Цяпэшак. У традыцыйнай культуры такія бакі жыцця, як сэксуальнасць, эратызм, адносіны з супрацьлеглым полам старанна кадаваліся, бо культура і нормы ставілі чалавека ў жорсткія рамкі, а спевы, гульні, танцы, якія адбываліся на гэтым этапе, дапамагалі чалавеку разняволіцца і праявіць свае прыродныя жаданні і інстынкты згодна нормам культуры.

На завяршальным этапе гульні пары, пачынаючы з polькі, танчаць шматлікія беларускія традыцыйныя танцы, сярод іх: Лявоніха, Полька, Кракавяк, Падыспанец, Полька-Бабка, Субота і г.д.

Жаніцьба Цярэшкі была на некалькі відаў:

1) Мокрая Цярэшка – пасля жаніцьбы адбываецца застолле, на якім жартуюць, п'юць гарэлку і ядуць прыгатаваныя дзяўчатамі стравы. *"Састаўляюць сталы, зносяць гарэлку, закуску... Кожны свае выстаўляе, а тады ўсе разам ядуць, каму што нравіцца."* (в. Кармалысы, Полацкі р-н) [3, с. 44]. Гэта больш позні варыянт гульні.

2) Сухая Цяпэшка – за стол не садзіліся, гулялі, а потым разыходзіліся.

Жаніцьба Цярэшкі – гэта сімвалічны шлюб моладзі, які суправаджаецца дзеяннямі і сімваламі эратычнага характару. У традыцыйнай культуры гэты характар не відавочны, бо ен кадуецца і шыфруецца. Найбольш распаўсюджаныя сюжэты звязаны з дзявочай цнатлівасцю і яе ўзроставым пераходам: *"Дзед бабу тапіць вядзець,/ А баба крычыць, ня йдзець./ Дзед бабу чабух на дно:/ -Дзядулька, мне й тут ладно!"* [3, с. 56]. У дадзеным выпадку паказаны сюжэт з патапленнем бабы дзедам, які характарызуе пераход "бабулькі" (якая дасягнула пубертатнага ўзросту) з дзявочага ў жаночы стан. Пераход з аднаго ўзросту ў іншы ва многіх традыцыйных грамадствах часта суправаджаецца абрадам ініцыяцыі. У выпадку з патапленнем адбылася ініцыяцыя вадой, а, напрыклад, ва Украіне існуе абрад "Каліта", на якім адбываецца ініцыяцыя хлопцаў. Маладыя хлопцы скачуць да Каліты - рытуальнага хлебу і спрабуюць адкусіць кавалак, калі атрымалась, яны могуць удзельнічаць у вечарынках з дзяўчатамі, хадзіць на спатканні, выконваць мужчынскія абавязкі, сватацца і ажаніцца [7].

Хвартух у беларускай традыцыйнай культуры сімвалізуе жаночыя геніталіі [8, с.217]. То бок сюжэт Цяпэшак у якіх распавядаецца пра разрыў хвартуха, сімвалізуе страту жаночай цнатлівасці: *"Каб цябе каршун задраў,/ Як ты мне хвартух падраў,/ Каб цябе пятух забіў,/Як жа ты мяне любіў!"* [2, с. 56]. Каб пазбегнуць разрыву хвартуха, дзяўчына пужае хлопца кадуком[7]: *"Каб цябе кадук стаптаў,/ Як ты мне хвартух падраў!/ Гэта мне матуся дала,/ Каб за Пятрусём была"* [2, с. 46].

Разам з сюжэтам пра хвартух сустракаецца вобраз быка, які сімвалізуе мужчынскі пачатак. Убачыць быка ва сне – азначае нараджэнне сына, а ўдар ягонымі рагамі – тое, што на яве "чалавек дабіваецца да жанчыны" [8, с. 217]. *"Цярэшку цярэжала,/ На печы не ўлежала./ Пайду я каровы даіць,/ А за мной жа бык бяжыць./ Каб цябе каршун задраў,/ Як жа ты мне хвартух парваў!"* [2, с. 114].

Існуюць тэксты Цярэшак, якія не шыфруюць эратычны кантэкст: *"Цярэшку біда стала:/ З кім яго жана спала?/ У полі пад ліпачкай, / З маладым Піліпачкай?/ У полі пад яворам, / З маладзенькім Ягорам?/ Ці пад гаем зеляненькім, / З казаком маладзенькім?"* [4, с. 126]. *"А што табе, дзядулька, стала,/ Я з табой ночачку спала./ Ці спала, ці не спала,/ Аж тая слава стала"* [2, с. 34]. Дашлюбныя палавыя зносіны забараняліся традыцыйнай культурай і нормамі. Як я казала раней, шмат сюжэтаў

---

[6] Зап. Г. Лутавай у 2012 г. ад Шчарбакова Алімпіяда Міхайлаўна 1937 г. н., в. Шастова Полацкага р-н

[7] Злы дух, які жыве ў лесе, у самым багістым балоце, на службе ў яго знаходзяцца ўсе меншыя і падначаленыя яму злыя духі.

абраднага дзеяння звязана з жаночай цнатлівасцю, такім чынам, калі дзяўчына страціла цноту да шлюбу, гэта пазбаўляла сюжэты Цярэшак сэнсу.

Дагэтуль не высветлена ад чаго паходзіць сам вобраз "Цярэшкі". Згодна са слоўнікам "Беларуская міфалогія", цярэшка – адно з імёнаў казачнага драўлянага хлопца, што ажывае на радасць бяздзетным "бацькам", можна дапусціць, што ў старажытныя часы абрадавае дзеянне "Жаніцьбы Цярэшкі" адбывалася пры драўлянай разьбяной выяве "Цярэшкі", які з'яўляецца апекуном сямейных пар [10, с. 546]. Беларускі даследчык Г. А. Барташэвіч кажа пра фалічны характар гэтага персанажа, бо слова "церэх" у беларускай мове азначае таўкач, які можна трактаваць як сімвалічны займеннік дзетароднага органа мужчыны [8, с.216]. Так сама існуе версія, што назва гульні паходзіць ад назвы аднайменнай вескі ў Вілейскім р-не, у гэтым выпадку "Цяпэшка" выступае як міфічны заснавальнік вескі, Божы чалавек, чараўнік, апякун людзей. Беларускі даследчык Таццяна Валодзіна суадносіць гульню "Жаніцьба Цярэшкі" з гульней "Цяцерка", на падставе таго, што гульні маюць аднолькавую любоўна-шлюбную мэту і спосаб яе дасягнення: моладзь падзяляюцца на два шэрагі (дзяўчаты з левага боку, хлопцы з правага) і хлопцы даганяюць сваю дзяўчыну, дзеянне суправаджаецца музыкай і спевамі.

Такім чынам, "Жанідьба Цярэшкі" – гэта калядна-абрадавы гульня-танец, мэта якога ажаніць моладзь, дасягнуўшую шлюбнага ўзросту. Сыходзячы з таго, што да падрыхтоўкі сцэнарыя, выбару песеннага, танцавальнага і музычнага матэрыялу, падбору пар ставіліся з усей адказнасцю і сур'езнасцю, відавочна, што гульня мела важнае значэнне для тагачаснай моладзі, бо нярэдка прыводзіла да стварэння сям'і. Гэта сімвалічная жаніцьба суправаджаецца дзеяннямі і сімваламі эратычнага характару. У традыцыйнай культуры гэты характар не відавочны, бо ен кадуецца і шыфруецца.

З аднаго боку, Каляды – гэта прамежкавы перыяд, які сімвалізуе хаос і разлад сацыяльнай структуры, бо парушаецца натуральны ход часу. З другога боку Каляды – перыяд, які аб'яўляе канец Старага і пачатак Новага гаспадарчага года, дзе кожная рэч і дзея, у тым ліку і Жаніцьба Цярэшкі, набывала знакавы, рытуальны характар і уплывала на будучае. Каб пераадолець хаос і разлад, трэба было падзяліць усе дарослае насельніцтва на пары [1, с. 105]. То бок "Жаніцьба Цярэшкі" мела знакавае значэння для вясковага соцыума, бо спрыяла ўпарадкаванню хаоса і наладжванню сацыяльнай структуры вескі.

"Жаніцьба Цярэшкі" найбольш прадстаўлена ў Лепельскім, Докшыцкім, Ушацкім, Полацкім і суседніх раёнах, яе тэрыторыя супадае з рассяленнем палачан, з рубяжамі Полацкай зямлі [2, с. 3]. Па гэтаму ігрышча мае не толькі вялікае нацыянальнае, а і рэгіянальная значэнне. "Жаніцьба Цярэшкі" – унікальная абрадавая гульня, якая на ўзроўні з "Полацкім канонам" і спевамі "бараны" на Купалле, з'яўляецца важнейшым сегментамі этна-культурнай спадчыны не толькі Падзвіння але і ўсей Беларусі. Занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

На прыканцы XX стагоддзя "Цярэшку" амаль не жанілі на весцы, што звязана з працэсамі урбанізацыі, калі вясковая моладзь масава з'язджала ў гарады. Заняпад ахапіў амаль усе бакі каляндарнай і сямейнай абраднасці, але дзякуючы набыццю незалежнасці Рэспублікай Беларусь, з'яўляецца грамадская цікавасць да этнакультурнай спадчыны народа, якая з'яўляецца грунтам беларускай ідэнтычнасці, унікальнасці, адметнасці. На падставе гэтага пачалося адраджэнне культуры. У выпадку з "Жаніцьбай Цярэшкі" спроба рэканструкцыі адбываецца ў в. Велеўшчына, Лепельскага раену: носьбіты традыцыі, з дапамогай маладзевых фальклорных калектываў і дзеячаў культуры, на працягу 15 гадоў адраджаюць лакальную вясковую традыцыю, абрад "Жаніцьба Цярэшкі" так сама не раз праводзіўся ў Мінску, куратарамі якой былі Яўген Барышнікаў, Сяржук Доўгушаў. Такім чынам, можна меркаваць, што гульнева-шлюбныя дзеі (імітацыя ірагаміі), якія тычацца Каляд, былі адказныя за касмалагічны момант змены гадоў, для стабілізацыі натуральнага ходу часу, ўзнаўлення долі, прадукцыйных сіл, і багацця ўсяго вясковага соцыўма.

ЛІТАРАТУРА

1. Бандарчык, В.К. Паэзія беларускага земляробчага календара / В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік, К.П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.
2. Валодзіна, Т.І. Цярэшка святое дзела: Жаніцьба Цярэшкі на Лепельшчыне (паводле сучасных запісаў) / Т.І. Валодзіна. – Віцебск, 2010. – 112 с.
3. Варфаламеева, Т.Б. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне/ Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 910 с.
4. Володина, Т.И. Белорусский этнографический фольклор/ Т.И. Володина, А.С. Федосик. - Москва: Ладомир, 2006. – 381 с.
5. Гойкнуў баравік. Народныя сьпевы ў выкананьні Рыгора Барадуліна [аўдыезапіс] / Этнаўсе. Рэжым доступа: https://ethno.by/audyioteka/701898368. – Дата доступу: 30.04.2020.

6. Госці калядныя: сімволіка традыцыйных персанажаў [Электронны рэсурс]/ Студэнскае этнаграфічнае таварыства. Рэжым доступу: http://set.ethno.by/?p=3918. – Дата доступу: 14.04.2020.
7. Каліта [відэазапіс] // YouTube. Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=bi1vqtAzEZQ. – Дата доступа: 19.04.2020.
8. Лобач, У.А. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры / У.А. Лобач // Studia mythologica slavika. – 2003. – № 6. – с. 205-248.
9. Салавей, М.Л. Жаніцьба Цярэшкі / М.Л. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.
10. Санько, С.І. Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік / С.І. Санько, Т.І. Валодзіна. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.